Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Першы намеснік Міністра
адукацыі Рэспублікі Беларусь
________________ А.І. Жук

“_____” ______________2010

Рэгістрацыйны № ТД-_____/тып.

# ВЫКАНАЛЬНІЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)**
**напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)**

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення
навучальных устаноў і кадраў
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________Н.Ю.Шмакава
“____” _____________ 2010

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________Ю.І.Міксюк
“____” _____________ 2010

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання вышэйшых навучальных
устаноў Рэспублікі Беларусь па
адукацыі ў галіне культуры і
мастацтваў
________________Б.У.Святлоў
“____” _____________ 2010

Рэктар дзяржаўнай установы
адукацыі “Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”
___________________М.І.Дзямчук
“____” ____________ 2010

Эксперт-нормакантралёр

________________________________
“____” ____________________2010

Мінск 2010

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**
*С.І.Дробыш,* загадчык кафедры беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”, прафесар

**Рэцэнзенты:**
*кафедра* харавога дырыжыравання музычна-педагагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка”;
*А.І.Смагін,* прафесар кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М.Шырокава”, доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**
*кафедрай* беларускай народнапесеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 04.10.2008);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 2 ад 11.11. 2008);
*навукова-метадычным* саветам па мастацтве музыкі (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб’яднання вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 3 ад 16.12. 2008)

Адказны за рэдакцыю: В.В.Каташвілі
Адказны за выпуск: С.І.Дробыш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна “Выканальніцкае майстэрства” з’яўляецца адной з асноўных дысцыплін у падрыхтоўцы будучых выканаўцаў.

Традыцыйна выкананне беларускай народнай песні цесна звязана з рухам, суправаджэннем на беларускіх народных інструментах і ўвасабленнем сцэнічнага вобраза ў залежнасці ад жанру народнай песні ці развіцця драматургічнай лініі беларускіх абрадаў.

Да выканаўцаў беларускай народнай песні прад’яўляюцца пэўныя патрабаванні ў авалоданні вакальна-харавымі, харэаграфічнымі, музычнымі і акцёрскімі навыкамі.

“Выканальніцкае майстэрства” як дысцыпліна з’яўляецца своеасаблівай творчай лабараторыяй, дзе выхоўваюцца лепшыя прафесійныя якасці выканаўцаў беларускай народнай песні. Заняткі па выканальніцкім майстэрстве праводзяцца ў цесным узаемадзеянні з іншымі дысцыплінамі, якія фарміруюць прафесійныя навыкі выканаўцы песні. Перш за ўсё гэта народныя гуртавыя спевы, сольныя спевы, народны танец, беларускі народны інструмент і акцёрскае майстэрства.

Агульны абъём дысцыпліны “Выканальніцкае майстэрства” складае 570 гадзін, з іх 278 – аўдыторныя, якія праводзяцца ў форме практычных заняткаў, астатнія – самастойная работа.

*Мэта* дысцыпліны – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды ў галіне традыцыйнай вакальнай, танцавальнай і музычнай культуры Беларусі, вытокаў фальклорнага майстэрства, яго формаў бытавання, багацця лексічнага матэрыялу і шматграннай манеры выканання.

У прыватнасці, дысцыпліна ахоплівае пытанні: разнастайнасць формаў і жанраў народнапесеннага, харэаграфічнага і музычна-інструментальнага выканання, музычна-стылістычныя асаблівасці; падбор і крытычнае асэнсаванне рэпертуарнага матэрыялу; прапаганда лепшых узораў традыцыйнай мастацкай культуры Беларусі і інш. У цесным спалучэнні з вывучэннем іншых дысцыплін падаецца методыка работы з фальклорным гуртам, выпрацоўка ўменняў і навыкаў інтэрпрэтацыі музычных і вакальна-харэаграфічных кампазіцый.

Асноўныя *задачы* дысцыпліны:

– асваенне навыкаў і прыёмаў народнапесеннага выканання;

– авалоданне навыкамі спеваў у складзе фальклорнага гурту;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выхаванне пластычнай культуры руху цела і натуральнай каардынацыі з голасам;

– асваенне асноўных прыёмаў малюнка танца ў спалучэнні з тэкстам песень.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– традыцыйную вакальна-харавую, танцавальную і музычную культуру Беларусі;

– сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і вопыту народных спевакоў;

– дыялектныя адметнасці розных рэгіёнаў Беларусі.

*Умець:*

– каардынаваць голас і рухі;

– свабодна трымацца на сцэнічнай пляцоўцы;

– працаваць над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах абрадаў каляндарнага цыкла;

– ажыццяўляць рэжысуру канцэртнага нумара.

У кожным семестры развучваецца пэўная колькасць твораў (5–7 у залежнасці ад складанасці). Увесь час навучання ідзе праца над раскрыццём выразных магчымасцей кожнага выканаўцы ці пэўнай групы выканаўцаў; разнастайнасцю выканальніцкіх стыляў і формаў (з суправаджэннем і без суправаджэння); уключэннем у рэпертуар твораў як у арыгінале, так і ў апрацоўках; засваеннем прыёмаў народнага выканання.

Праграма дысцыпліны рэалізуецца на практычных занятках, а таксама ў працэсе самастойнай работы. Асновай набыцця ўменняў і навыкаў з'яўляецца падрыхтоўка і ўдзел студэнтаў у канцэртных праграмах як выканаўцаў-салістаў, так і ў складзе фальклорных гуртоў і харавых калектываў. У гэтых умовах праграма прадугледжвае абавязковую сістэму кантрольных патрабаванняў на пэўных этапах навучання, якая адпаведна ўлічвае розныя ўзроўні ведаў і ўменняў.

У мэтах заахвочвання неабходна выкарыстоўваць формы публічнай атэстацыі, напрыклад выступленне з канцэртнымі праграмамі. Канцэртна-выканальніцкая дзейнасць з'яўляецца адной з формаў вучэбна-выхаваўчай работы. Дзякуючы ёй актывізуецца працэс навучання спецыяліста належных кампетэнцый.

Канцэртная практыка спрыяе развіццю навыкаў калектыўнай творчасці, сцэнічнага пераўвасаблення, удасканаленню выканальніцкіх навыкаў, азнаямленню з методыкай арганізацыі канцэртнага выступлення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Выканальніцкая дзейнасць можа ажыццяўляцца ў форме святочных і тэматычных канцэртаў, творчых справаздач, удзелу ў агульнаўніверсітэцкіх мерапрыемствах.

У канцы кожнага навучальнага года праводзяцца творчыя справаздачы студэнтаў.

Вынікам засваення вучэбнага матэрыялу курса “Выканальніцкае майстэрства” з’яўляецца дзяржаўны іспыт – экзамен-канцэрт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № п/п | Тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін, практычных заняткаў |
|---|---|---|
| 1 | Асноўныя навыкі народнай манеры спеваў | 14 |
| 2 | Асноўныя прыёмы народна-харавога выканання. Агульная манера гукаўтварэння | 12 |
| 3 | Асноўныя навыкі выканання народных песень з элементамі руху | 14 |
| 4 | Выканальніцкая культура народнай песні | 20 |
| 5 | Навыкі выканання народных песень у складзе невялікіх гуртоў | 14 |
| 6 | Выкарыстанне спецыфічных вакальна-харэаграфічных прыёмаў народнага выканання | 20 |
| 7 | Знаёмства з навыкамі імправізацыі | 16 |
| 8 | Дакладнае інтанаванне меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў | 20 |
| 9 | Асноўныя формы карагодаў | 12 |
| 10 | Авалоданне навыкамі ігры на беларускіх народных інструментах | 14 |
| 11 | Работа над гучаннем голасу ва ўсіх рэгістрах | 14 |
| 12 | Дыялектныя асаблівасці некаторых рэгіёнаў Беларусі | 14 |
| 13 | Песні каляндарна-абрадавага цыкла | 12 |
| 14 | Сцэнічная інтэрпрэтацыя танцавальнага фальклору | 16 |
| 15 | Акцёрскае майстэрства ў час выканання народнай песні | 14 |
| 16 | Манера выканання ў розных рэгіёнах Беларусі | 20 |
| 17 | Танцавальны малюнак і яго ўзаемасувязь з выкананнем народнай песні | 20 |
| 18 | Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену | 12 |
| | **Усяго…** | **278** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### *Тэма 1. Асноўныя навыкі народнай манеры спеваў*

Народная манера спеваў як комплекс вакальна-выканальніцкіх сродкаў і прыёмаў, якія склаліся на аснове мясцовых пеўчых традыцый пад уздзеяннем бытавога пеўчага асяроддзя. Сувязь народнай манеры спеваў з асаблівасцямі дыялекту, музычнай мовы і выканальніцкага вопыту пакаленняў народных спевакоў адной мясцовасці.

### *Тэма 2. Асноўныя прыёмы народна-харавога выканання. Агульная манера гукаўтварэння*

Спецыфічныя прыёмы выразнасці. Сольны спеў як своеасаблівая падрыхтоўка да ансамблевага выканання. Дыкцыя і сінхроннасць вымаўлення тэксту. Адзінства, цэласнасць успрымання мастацкага вобраза ў час выканання народнай песні гуртам.

### *Тэма 3. Асноўныя навыкі выканання народных песень з элементамі руху*

Вытокі развіцця беларускага народнага танца. Беларускі народны танец і яго выкарыстанне ў час выканання народнай песні. Асноўныя прыёмы выканання карагодных, гульнявых і танцавальных песень. Выкарыстанне жэста ў народных спевах, своеасаблівых рухаў.

### *Тэма 4. Выканальніцкая культура народнай песні*

Шчырасць, непасрэднасць, эмацыянальнасць выканання народнай песні. Дэталёвая нюансіроўка выконваемага твора. Выразнасць вымаўлення тэксту як адно з важных сродкаў народна-выканальніцкага майстэрства. Дакладнае інтанаванне пэўных меладычных і гарманічных спалучэнняў. Спевы ва унісон і актаву.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Навыкі выканання народных песень у складзе невялікіх гуртоў*

Ансамблевае гучанне галасоў невялікага гурту. Пашырэнне дыяпазону галасоў вакальнай групы. Авалоданне навыкамі спеваў у міксавым і галаўным рэгістрах. Згладжванне і спалучэнне рэгістраў.

### *Тэма 6. Выкарыстанне спецыфічных вакальна-харэаграфічных прыёмаў народнага выканання*

Карагод як самы распаўсюджаны жанр беларускага народнага танца. Гульнявыя карагоды і іх песенная аснова. Арнаментальныя карагоды як абрамленне песеннага тэксту. Навыкі спеваў у час руху па крузе. Дэталёвая работа над зместам гульнявых песень, выразнасцю ўсіх мізансцэн і сцэнічнай актыўнасцю ўдзельнікаў хору ці фальклорнага гурту.

### *Тэма 7. Знаёмства з навыкамі імправізацыі*

Роля імправізацыі ў народным выкананні. Спевы з падгалоскамі ва ўмовах выканання бытавых народных песень. Харавыя распевы песень, раней запісаных у адзін голас. Стварэнне творчых груп. Расстаноўка спевакоў у час імправізацыі.

### *Тэма 8. Дакладнае інтанаванне меладычных і гарманічных гукаспалучэнняў*

Спевы ў складзе з дзяленнем на дзве-тры групы ў дыяпазоне груднога рэгістра. Правільнае інтанаванне характэрных меладычных ліній. Асаблівасці інтанавання гарманічных гукаспалучэнняў. Навыкі стройных ансамблевых спеваў.

### *Тэма 9. Асноўныя формы карагодаў*

Далейшае вывучэнне беларускага народнага танца. Асноўныя элементы беларускіх карагодаў і іх выкарыстанне ў рэпертуары фальклорных гуртоў і харавых калектываў. Веснавыя карагоды. Купальскія карагоды. Гарадскі бытавы танец і яго выкарыстанне ў рэпертуары фальклорных гуртоў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 10. Авалоданне навыкамі ігры на беларускіх народных інструментах***

Выкарыстанне народных інструментаў пры выкананні беларускіх народных песень з суправаджэннем. Асноўныя навыкі ігры на народных інструментах. Авалоданне навыкамі ігры на ўдарных (шумавых) народных інструментах. Гармонь і яе выкарыстанне ў суправаджэнні прыпевак.

***Тэма 11. Работа над гучаннем голасу ва ўсіх рэгістрах***

Далейшае набыццё навыкаў валодання ўсімі рэгістрамі голасу. Спевы ў грудным, галаўным і мікставым рэгістрах. Плаўны пераход з аднаго рэгістра ў другі. Асваенне прыёмаў народнага выканання (глісандзіраванне, спад, скідванне і інш.).

***Тэма 12. Дыялектныя асаблівасці некаторых рэгіёнаў Беларусі***

Выкарыстанне спецыфічных вымаўленчых прыёмаў пры развучванні паэтычнага тэксту народных песень. Вывучэнне дыялектных асаблівасцей розных рэгіёнаў Беларусі. Выкананне народных песень з захаваннем некаторых асаблівасцей рэгіянальных дыялектаў.

***Тэма 13. Песні каляндарна-абрадавага цыкла***

Асноўныя сюжэты песень каляндарна-абрадавага цыкла. Песні зімовага перыяду. Беларускія вяснянкі. Купальскія песні. Восеньскія песні. Беларускае вяселле. Асноўныя персанажы калядных і купальскіх народных песень.

***Тэма 14. Сцэнічная інтэрпрэтацыя танцавальнага фальклору***

Спецыфіка выканання народных песень з элементамі руху. Асноўныя элементы беларускага народнага танца. Уменне ўжываць традыцыйную беларускую харэаграфію як абрамленне песні (падтанцоўка). Асноўныя запісы танцавальнага фальклору і іх выкарыстанне кіраўнікамі фальклорных гуртоў. Работа над вакальна-харэаграфічнымі кампазіцыямі па матывах песень каляндарна-абрадавага цыкла.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Тэма 15. Акцёрскае майстэрства ў час выканання народнай песні***

Асноўныя прынцыпы стварэння мастацкага вобраза. Асноўныя сюжэты беларускіх абрадаў. Сцэнічныя вобразы ў веснавых абрадах. Асаблівасці акцёрскага майстэрства ў час выканання роляў некаторых персанажаў купальскіх абрадаў і абрадаў зімовага перыяду.

***Тэма 16. Манера выканання ў розных рэгіёнах Беларусі***

Прыёмы народнапесеннага выканання. Выкананне народных песень з захаваннем асаблівасцей рэгіянальных дыялектаў. Асаблівасці фактуры харавых партытур розных рэгіёнаў. Выкарыстанне ў харавых калектывах сучаснай беларускай народнапесеннай харэаграфіі. Падбор і апрацоўка фальклорнага матэрыялу. Рэжысура канцэртнага нумара і праграмы выступлення калектыву ў цэлым.

***Тэма 17. Танцавальны малюнак і яго ўзаемасувязь з выкананнем народнай песні***

Асноўныя прыёмы народнапесеннага выканання карагода як самага распаўсюджанага і старажытнага жанру беларускага народнага танца. Спецыфічныя вакальна-харэаграфічныя прыёмы народнага выканання. Асноўныя элементы беларускага народнага танца. Сцэнічная інтэрпрэтацыя харэаграфічнага фальклору. Праблемы пеўчага дыхання ў сувязі з выкананнем карагодных песень і падтанцовак.

***Тэма 18. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену***

Работа над праграмай дзяржаўнага экзамену-канцэрта. Замацаванне навыкаў народнага выканання з улікам народна-пеўчых традыцый Беларусі. Замацаванне навыкаў выканання беларускіх абрадаў і вакальна-харэаграфічных кампазіцый. Рэжысура канцэртнай праграмы: ідэйная накіраванасць; развіццё агульнай драматургічнай лініі; завязка, кульмінацыя і фінал канцэртнай праграмы; лагічнае выкарыстанне харэаграфіі і персанажаў беларускіх народных абрадаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

## Прыкладны рэпертуар

**Беларускія народныя песні**

А калі той вечар. Апр. М.Сіраты.
А ў сенях, сенях. Апр. В.Рамановіча.
А я чарнява. Апр. С.Дробыша.
Беларускія забаўлянкі. Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя. Апр. М.Сіраты.
Біла жонка мужыка. Апр. М.Сіраты.
Бяседная. Апр. М.Сіраты.
Вол бушуе… Апр. М.Дрынеўскага.
Вяне рута. Апр. К.Паплаўскага.
Вярба, вярба. Апр. М.Сіраты.
Гай зеляненькі. Апр. С.Дробыша.
Добры вечар, дзяўчыненька. Апр. Н.Баканавай.
Дубравушка. Апр. С.Беражнога.
Ды ў зялёнай дуброве. Апр.Г.Цітовіча.
Ды ўжо сонейка. Апр. К.Паплаўскага.
Ды што ў садзе лялееецца. Апр. Г.Цітовіча.
Жаваронačкі, прыляціце. Апр. Г.Цітовіча.
І туды гара… Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя. Апр. М.Сіраты.
Із-пад гор узлятаў сокал. Апр. М.Сіраты.
Калі каліна не цвіла. Апр. А.Казака.
Каля кузні ішла. Апр. С.Дробыша.
Каля майго церама. Апр. Ю.Смялкоўскага.
Камар лазню тапіў. Апр. І.Кузняцова.
Караподная. Апр. Н.Сакалоўскага.
Кукавала зязюля. Апр. К.Паплаўскага.
Купалася Кася ў моры. Апр. Н.Баканавай.
Лайдакі. Апр. М.Сіраты.
Лянок. Апр. Г.Цітовіча.
Ляціць сарока. Апр. К.Паплаўскага.
На вуліцы мокра. Апр. С.Дробыша.
На Купалле. Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя. Апр. М.Сіраты.
На хрэсьбінах. Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя. Апр. М.Сіраты.
Ой, да белая бяроза. Апр. Г.Цітовіча.
Ой, дзе ж ты была. Апр. С.Дробыша.
Ой, забялелі снежкі. Апр. У.Зяневіча.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ой, зелена, зелена. Апр. М.Сіраты.
Ой, ляцелі гусі. Апр. Н.Сакалоўскага.
Ой, на гары мак. Апр. С.Дробыша.
Ой, павей, буйны вецярочак. Апр. К.Паплаўскага.
Ой, пайду я на даліну. Апр. С.Дробыша.
Ой, рана на Йвана. Апр. М.Дрынеўскага.
Ой, сівы конь бяжыць. Апр. А.Кашпура.
Ой, сівы конь бяжыць. Апр. С.Дробыша.
Ой, там на гарэ. Апр. М.Сіраты.
Ой ты, белая бяроза. Апр. М.Сіраты.
Ой, у лесе, лесе. Апр. М.Корсака.
Ой, у полі азярэчка. Апр. С.Дробыша.
Ой, у полі туманочак. Апр. М.Дрынеўскага.
Ой, у полі. Апр. Н.Сакалоўскага.
Па грыбы пайшла. Апр. С.Дробыша.
Па рацэ, рацэ гаголушка плыве. Апр. У.Зяневіча.
Пайшла Марта. Апр. С.Дробыша.
Пасеялі дзеўкі лён. Апр. Ф.Стацэнка.
Прымакі. Апр. С.Дробыша.
Рэчанька. Апр. Г.Цітовіча.
Там, дзе ручалачка бяжала. Апр. А.Шагава.
Цераз лес, лясочак. Вакальна-харэаграфічная кампазіцыя. Апр. М.Сіраты.
Цераз рэчаньку. Апр. М.Дрынеўскага.
Ці ўсе лугі пакошаны. Апр. І.Кузняцова.
Чабарок. Апр. К.Паплаўскага.
Чапурушка. Апр. С.Дробыша.
Чырвоная вяргінечка. Апр. Н.Сакалоўскага.
Я каліну ламала. Апр. М.Сіраты.
Я каліну-маліну ламала. Апр. С.Дробыша.
Як пагнала бабуленька. Апр. К.Паплаўскага.
Як сарву я ружы кветку. Апр. К.Сакалоўскага.
Як служыла ў пана. Апр. С.Дробыша.
Янка. Апр. Н.Сакалоўскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобл. / уклад. В.А.Захарава [і інш.]; уклад. муз. часткі У.І.Раговіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 384с.
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобл. / уклад. В.Д.Ліцвінка; уклад. муз. часткі Г.Р.Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 477с.
3. *Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 1998. – 285с.
4. *Гайдук, М.* Песні Беласточчыны / М.Гайдук. – Мн.: Бел. навука, 1997. – 366 с.
5. *Грабеншчыкоў, С.М.* Сцэнічныя танцы / С.М.Грабеншчыкоў. – Мн.: Беларусь, 1968. – 8 с.
6. *Гуд, П.* Ад Каляд да Пакроваў/ П.Гуд. – Мн.: Красіка-прынт, 2000. – 223 с.
7. *Дорофеев, Н.* Организация и работа фольклорного коллектива / Н.Дорофеев. – М.: Всесоюз. науч.-метод. центр нар. творчества и культ.-просвет. работы, 1980. – 4 с.
8. *Захаров, Р.* Сочинение танца / Р.Захараў. – М.: Искусство, 1980. – 237 с.
9. *Калугина, Н.В.* Методика работы с народным хором.: учеб. для муз. вузов. / Н.В.Калугина. – 2-е изд., перераб. и доп. – М.: Музыка, 1977. – 256 с.
10. *Каляда, А.* Сцэнічная мова / А.Каляда, А.Шагідзевіч. – Мн.: Вышэйш. шк., 1983. – 170 с.
11. *Менабени, А.Г.* Методика обучения сольному пению: учеб. пособие для пед. ин-тов / А.Менабени. – М.: Просвещение, 1987. – 93 с.
12. *Мешко, Н.К.* Искусство народного пения: практ. руководство и методика обучения исполнителей нар. пения / Н.К.Мешко. – М.: Луч, 2000. – 80 с.
13. *Назіна, І.Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І.Д.Назіна. – Мн.: Беларусь, 1997. – 239 с.
14. *Скарабагатчанка, А.В.* Беларускія музычныя інструменты ХХ стагоддзя / А.Скарабагатчанка. – Мн.: Бел.навука, 2001. – 397 с.
15. *Христиансен, Л.* Встречи с народными певцами. Воспоминания / Л.Христиансен. – М.: Сов. композитор, 1984. – 168 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. *Цітовіч, Г.* Анталогія беларускіх народных песень / Г.Цітовіч. – 2-е выд. – Мн.: Беларусь, 1975. – 616 с.

17. *Чишко, О.* Певческий голос и его свойства / О.Чишко. – М.: Музыка, 1966. – 48 с.

18. *Чурко, Ю.М.* Беларускі харэаграфічны фальклор / Ю.М.Чурко. – Мн.: Вышэйш.шк., 1990. – 415 с.

19. *Шамина, Л.В.* Работа с самодеятельным коллективом / Л.В.Шамина. – М.: Музыка, 1983. – 175 с.

*Дадатковая*

1. *Козенка, М.* Лексіка беларускага народна-сцэнічнага танца / М.Козенка; Бел. ін-т праблем культуры. – Мн.: Полымя, 1993. – 110 с., іл.

2. *Купальскія і пятроўскія песні* / уклад. А.С.Ліса, С.Т.Асташэвіч; уклад. муз. часткі Г.В.Таўлай: рэд. А.С.Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985.

3. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Паазер'я / З.Мажэйка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.

4. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З.Мажэйка, Т.Б.Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука, 1999. – 391 с.

5. *Медведева, М.* Методика хоровой аранжировки для руководителей фольклорных песенных коллективов / М.Медведева. – М.: ВНМЦ НТ и КПР, 1982. – 87с.

6. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Можейко. – М.: Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 151 с.

7. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я.Можейко. – М.: Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 183 с.

8. *Раговіч, У.* Вянок беларускіх народных песень / У.Раговіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.

9. *Руднева, А.В.* Русский народный хор и работа с ним / А.В.Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. – С. 49.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ВЫКАНАЛЬНІЦКАЕ МАЙСТЭРСТВА**

**Тыпавая вучэбная праграма
для вышэйшых навучальных устаноў
па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках)
напрамку 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэдактар В.В.Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л.М.Мельнік

Падпісана ў друк 2010 г. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 0,8. Ул.-выд. арк. 0,5.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 02.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.